**Н.В.Петухова,** *аспірантка*

# ФАЛЬКЛОР ЯК СРОДАК ФАРМІРАВАННЯ Ў ДЗЯЦЕЙ ЭСТЭТЫЧНЫХ АДНОСІН ДА ПРЫРОДЫ

Створаныя ў мінулым духоўныя каштоўнасці і сёння не страчваюць сваёй актуальнасці. З узнікненнем сур'ёзных экалагічных праблем сучаснасці, адной з вядучых тэм для навуковага разважання становіцца асэнсаванне эколага-эстэтычнага патэнцыялу традыцыйных культур (В.В.Анохіна, Н.Ш.Блягоз, В.С.Болбас, А.І.Зелянкоў, Н.У.Самерсава, А.К.Шульжэнка і інш.). У тэорыі і практыцы экалагічнага выхавання паступова нарадзіліся разуменне і імкненне да частковага яднання эстэтычнага і экалагічнага выхавання. Гэта абумоўлена вялікім выхаваўчым патэнцыялам, які змяшчае эстэтычная дзейнасць. Да таго ж сінтэз экалагічнага і эстэтычнага выхавання ставяць сабе агульнай мэтай фарміраванне цэласнага погляду на прыроду як на унікальны аб'ект: "Прыгажосць прыроды з'яўляецца моцным сродкам эстэтычнага выхавання: разуменне яе прыгажосці вядзе да ашчадных адносін да яе чалавека" [3, с. 88].

На працягу ўсёй доўгай гісторыі чалавецтва існуе неабходнасць узгаднення дзейнасці чалавека з магчымасцямі прыроды. Менавіта такое ўзгадненне абумоўлівае ўмовы стабільнага існавання грамадства, развіцця, прагрэсу. Прыродны рэгламент, прыродныя магчымасці і абмежаванні ўсведамляліся людзьмі яшчэ ў глыбокай старажытнасці і прымалі форму шматлікіх правілаў паводзін, якія грунтаваліся на асэнсаванні вопыту папярэдніх пакаленняў і звычайна маюць выгляд маральных патрабаванняў. Старажытныя правілы ўзаемаадносін чалавека з прыродай і сёння не страчваюць сваёй актуальнасці, іх выхаваўчае ўздзеянне мы можам асэнсаваць праз знаёмства з народнымі казкамі, легендамі, паданнямі, міфамі, песнямі, абрадамі, у якіх знайшлі адлюстраванне ўсе прыродныя стыхіі – зямля, вада, вецер, сонца, усе поры года – лета, восень, зіма, вясна.

Многія аўтары і педагогі лічаць, што фарміраванне эстэтычных адносін да прыроды звязана з засваеннем эстэтычных і экалагічных ведаў, бо эстэтычныя адносіны да прыроды грунтуюцца на аснове сінтэзу эстэтычнага і экалагічнага выхавання. Мы ў сваёй практычнай дзейнасці (педагагічны эксперымент праводзіцца ў фальклорным калектыве "Сунічкі") не ставім сабе за мэту

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

засваенне толькі экалагічных ці толькі эстэтычных ведаў аб прыродзе, а імкнемся сфарміраваць эстэтычныя адносіны да прыроды на падставе этнакультурнага выхавання, якое мы разумеем як дзейнасць па вывучэнні, засваенні і трансляцыі беларускай народнай традыцыйнай культуры як цэласнай грамадска-гістарычнай з'явы, у якой адлюстраваны светапогляд, маральна-этычныя і эстэтычныя каштоўнасці беларускага народа. Такім чынам, наша галоўная задача ў гэтым напрамку – пазнаёміць дзяцей з асаблівасцямі прыроднага светаўспрымання беларусаў, этнаэкалагічным патэнцыялам.

На эстэтычную свядомасць беларускага народа зрабілі велізарны ўплыў прыродна-геаграфічныя ўмовы. “Назіраючы за прыродай, чалавек вучыўся мэтанакіраванасці і гармоніі. Паслядоўнае чаргаванне часін года, сезонныя змены прыроды, пераход яркіх летніх і асенніх колераў у строгія і спакойныя адценні зімы, у пяшчотную пастэль вясны развіваюць эстэтычныя пачуцці і густ” [1, с. 72]. Прыгажосць у прыродзе – гэта жыццё. Яна заўсёды юная, моцная, маляўнічая, яна дорыць чалавеку шчаслівыя імгненні. Успрымаючы з'явы прыроды, старажытны чалавек суадносіў іх са сваімі душэўнымі адчуваннямі, ідэаламі, ачалавечваў, адушаўляў іх (дзяўчына – каліна, жанчына – вярба, хлопец – дуб).

Адушаўленне прыроды (анімізм) для мэт выхавання давала добры плён, забяспечваючы гуманныя адносіны да прыроды. Працягам гэтай традыцыі сёння можна лічыць фарміраванне эстэтычных адносін да прыроды, а потым – экалагічнага мыслення. Такія аспекты дзейнасці ў галіне этнакультурнага выхавання, як знаёмства з традыцыйнымі гульнямі, побытавым танцам і каляндарнымі спевамі, могуць стаць “спрыяльным фактарам для лепшага ўсведамлення дзецьмі сваёй лучнасці з прыродай” [2, с. 115].

На думку спецыялістаў (В.С.Болбас, Н.У.Самерсава, І.А.Валіева, Э.Ф.Маскалёва), этнакультурнае выхаванне спрыяе пераўтварэнню характэрных для сучаснага грамадства рацыянальных, утылітарна-практычных поглядаў на прыроду і фарміраванню эмацыянальных, эстэтычных. Н.У.Самерсава лічыць, што “складанасць сучаснай экалагічнай сітуацыі выклікае неабходнасць вяртання да гістарычнага вопыту продкаў у захаванні прыроды, зафіксаванаму ў абрадах, звычаях, рытуалах, у беларускіх народных песнях, танцах, казках і легендах, якія раскрываюць характар узаемаадносін паміж чалавекам-земляробам і прыродным асяроддзем” [4, с. 26].

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

Аналіз поглядаў навукоўцаў XX ст. А.Апрэсяна, В.Бажэнавай, М.Калесніка, Н.Кірылавай, Л.Сталовіча, Б.Ліхачова, А.Бурава, А.Тэадора і інш. сведчыць, што эстэтычныя адносіны маюць складаную структуру; яе кампаненты: эстэтычнае ўспрыманне (успрымальны кампанент), пачуцці, эмоцыі (эмацыянальны), эстэтычныя веды, густ (кагнітыўны кампанент), эстэтычныя патрэбнасці (матывацыйна-патрэбнасны кампанент), якія рэалізуюцца ў пэўных відах эстэтычнай дзейнасці (дзейнасны кампанент).

Усе кампаненты структуры эстэтычных адносін могуць быць выкарыстаны і рэалізаваны ў розных формах дзейнасці па этнакультурным выхаванні:

1. Знаёмства с традыцыйным прыродным светаўспрыманнем нашых продкаў праз вывучэнне, чытанне старажытных міфаў і легенд (кагнітыўны кампанент), якое прадугледжвае абмеркаванне па тэмах:

– «Святы “Сонечнага крыжа”»;
– “Паэтычныя погляды старажытных беларусаў на прыроду”;
– “Шанаванне дрэў старажытнымі беларусамі”;
– “Жыватворныя крыніцы Беларусі”;
– “Легендарныя азёры і балоты Беларусі”;
– “Рэкі ў жыцці і міфалогіі Беларусі”;
– “Жывёльны свет у міфалагічнай свядомасці Беларусі”.

2. Вывучэнне і выкананне народных песень (эмацыянальны, успрымальны, кагнітыўны, дзейнасны і матывацыйна-патрэбнасны кампаненты).

3. Знаёмства з каляндарнымі абрадамі і іх пастаноўка ў натуральным ландшафце як спосаб ушанавання прыроднага свету і замацавання традыцыі ў паводзінах чалавека (кагнітыўны, успрымальны, дзейнасны, эмацыянальны і матывацыйна-патрэбнасны кампаненты).

4. Стварэнне фальклорных музычных кампазіцый, фантазій паводле казак, міфаў і каляндарных абрадаў (кагнітыўны, успрымальны, дзейнасны, эмацыянальны і матывацыйна-патрэбнасны кампаненты).

5. Матэрыяльнае стварэнне ўзораў традыцыйнай народнай культуры: строяў, упрыгожанняў, рэквізіту (кагнітыўны, дзейнасны і матывацыйна-патрэбнасны кампаненты).

6. Экскурсіі да святых крыніц у Мінску і ў Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і быту (в. Строчыцы) (кагнітыўны,

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

успрымальны, дзейнасны, эмацыянальны і матывацыйна-патрэбнасны кампаненты).

Такім чынам, напрыканцы варта зрабіць наступныя высновы.

Сур'ёзныя экалагічныя праблемы сучаснасці вымушаюць звярнуць увагу даследчыкаў і педагогаў на эколага-эстэтычны патэнцыял традыцыйных культур, у якіх зафіксаваны старажытныя і дагэтуль актуальныя правілы гарманічнага суіснавання чалавека і прыроды. Засваенне і разуменне гэтых правілаў вельмі паспяхова можа адбывацца ў розных відах дзейнасці па этнакультурным выхаванні, якое спрыяе пераўтварэнню характэрных для сучаснага грамадства рацыянальных, утылітарна-практычных поглядаў на прыроду ў эмацыянальныя, эстэтычныя. Асэнсаванне традыцыйнага светапогляду нашых продкаў і яго практычнае ўвасабленне ў эстэтычнай дзейнасці (спевы, выкананне абрадаў і інш.) з'яўляюцца трывалай асновай для фарміравання эстэтычных адносін да прыроды.


1. *Арлова, Г.П.* Беларуская народная педагогіка / Г.П.Арлова. – Мн.: Нар. асвета, 1993. – 120 с.

2. *Болбас, В.С.* Этычная педагогіка беларусаў / В.С.Болбас. – Мн.: Бел. навука, 2004. – 175 с.

3. *Котикова, О.П.* Эстетическое воспитание старшеклассников / О.П.Котикова. – Мн.: Універсітэцкае, 1999. – 155 с.

4. *Самерсова, Н.В.* Оптимизация экологического образования и воспитания подростков в условиях социокультурной сферы: дис. ...канд. пед. наук / Н.В.Самерсова. – Мн.: Бел. гос. ун-т культуры и искусств, 1997. – 142 с.


БИБЛИОТЕКА БГУКИ